***Бароўка, В.Ю. Мастацкае народазнаўства ў беларускай літаратуры XX стагоддзя (на матэрыяле прозы) / В.Ю. Бароўка. – Віцебск: УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2009. – 211 с.***

У цэнтры даследавання В. Бароўкі паняцце «мастацкае народазнаўства». Аўтар прысвячае тэарэтычнаму тлумачэнню паняцця асобную першую главу «Мастацкае народазнаўства: тэарэтычны аспект», дзе дае вызначэнне паняццю народазнаўства як метасістэме, складнікамі якой з'яўляюцца фальклор, міфалогія, этнаграфія, гісторыя, сацыялогія, мастацкая літаратура. У прыватнасці, у апошняй народазнаўства выяўляецца як знешняя ці латэнтная (рэдукаваная) мастацкая рэальнасць. Пры гэтым аўтар узгадвае і адмаўляецца ад паняццяў, што абмяркоўваліся літаратуразнаўцамі раней (рэгіяналізм, этнаграфізм, этнаграфічны фальклярызм, мясцовы каларыт, народнасць), як састарэлых ці скампраментаваных сацыяльнай вульгарнай крытыкай. Бароўка не толькі дае вызначэнне, але стварае асабістыя класіфікацыі: па спосабах ужывання народазнаўчага матэрыялу ў мастацкай прозе (аб'ектывізаваны, суб'ектывізаваны і сімбіятычны), па «прынцыпах выкарыстання народазнаўчага матэрыялу» («захаванне аўтахтоннасці этнаграфічна-бытавых адзінак у тэксце і іх трансфармацыя») [1, с. 21], па функцыях ужывання таго ж матэрыялу (культуралагічная, сэнсава-генератыўная, сюжэтна-кампазіцыйная, характаратворчая). На заканчэнне тэарэтычнага аналізу аўтар прапануе наступныя віды «ўзнаўлення народазнаўчага матэрыялу» – сацыяльны, бытавы, псіхалагічны і ландшафтны, або пейзажны [1, с. 24].

Прыведзеная класіфікацыя даволі выразна нагадвае агульны літаратуразнаўчы падыход да вызначэння любой тэмы (не толькі народазнаўства) і спосабаў яе ўвасаблення ў мастацкім тэксце. Вызначаныя прынцыпы, тыпы і віды з'яўляюцца асноўнымі характарыстыкамі ў далейшым аўтарскім крытычным аналізе беларускай мастацкай прозы XX стагоддзя, які, у параўнанні з тэорыяй, займае ў манаграфіі значна больш месца (164 старонкі супраць 21), і заснаваны на храналагічна-біяграфічным прынцыпе, а не на тэматычным ці семантычным, як гэта, здаецца, вызначалася назваю манаграфіі.

Хранаграфія ж нацыянальнага літаратурнага працэсу прадстаўлена ў манаграфіі «традыцыйна сучасна»: улічваючы памылкі савецкага літаратуразнаўства (зважаючы на «вытокі мастацкага народазнаўства» ў літаратуры XIX стагоддзя, упэўнена канстатуючы аб «фарміраванні традыцый эстэтычнага асваення народазнаўчага матэрыялу» [1, с. 32] напачатку XX стагоддзя, не чакаючы рэвалюцыйных падзей) ды ў кантэксце сусветнай (шматнацыянальнай) літаратуры. Так, «Нарадзіны» Вацлава Ластоўскага і «Адвечная песня» Янкі Купалы параўноўваюцца з «Жыццём чалавека» Леаніда Андрэева, тыпалагічна блізкімі становяцца «Ціхая плынь» Максіма Гарэцкага і «Вёска» Івана Буніна, «Любіць ноч – правы пацукоў» Юрыя Станкевіча і «Чума» Альбера Камю, творчасць Васіля Каваля і Сяргея Ясеніна, Кузьмы Чорнага і Уільяма Фолкнера, а антыгерой Віктара Карамазава можа быць пастаўлены ў адзіны рад з «маргінальным тыпам асобы, што парывае з мінулым, з вясковымі каранямі і ў выніку страчвае станоўчыя маральныя арыенціры» ў творчасці Фёдара Абрамава, Віля Ліпатава, Алега Чарнагуза, Юрыя Шчарбака і іншых аўтараў так званай «вясковай прозы» [1, с. 142] і г.д.

Даследчыца жадае асэнсаваць «дынаміку мастацкага народазнаўства» [1, с. 24], але ўжо ў літаратурным працэсе пачатку XX стагоддзя, на думку аўтара, сфарміравана літаратурная формула ўвасаблення ў беларускай прозе народазнаўства – дзякуючы творчаму абгрунтаванню Якубам Коласам «ідэі адлюстравання быцця праз быт» [1, с. 41], якая актуальная не толькі для прозы І. Пташнікава, В. Карамазава, А. Кудраўца, А. Жука і іншых пісьменнікаў, але і «для дастаткова далёкага да пабытавай праблематыкі В. Быкава» [1, с. 146]. І, напэўна, было б тут да месца ўзгадаць быкаўскую тэму «шараговага беларуса», паднятую папярэдняй крытыкай (народазнаўства ж аналізуецца!), але аўтар чамусьці абыходзіць гэтую тэму і заўважае толькі знакі і сімвалы традыцыйнай культуры ў творах Быкава (Вялікдзень, напрыклад, у «Круглянскім мосце» і «Велікодным яйку»). Адказ на свае непаразуменні мы знаходзім далей: ён – у выбары этнаграфічнай тэмы.

Можа таму, што няма дынамікі, а ў кожным часе ёсць свае рэалісты, рамантыкі, мадэрністы, свае феномены і традыцыйныя стэрэатыпы, раздзелы манаграфіі так падобныя ў назвах: «Развіццё мастацкага даследавання народа ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя» (2 раздзел), «Семантыка-аксіялагічная спецыфіка мастацкага народазнаўства ў беларускай прозе 30-х – першай палове 50-х гадоў XX стагоддзя» (3 раздзел), «Паглыбленае спасціжэнне нацыянальнага свету і чалавеку ў прозе другой паловы 50-х гадоў – канца XX стагоддзя» (4 раздзел).

Па вялікім рахунку, Бароўка мае рацыю, літаратура, як этнаграфія, сацыялогія, культуралогія і яшчэ шэраг грамадазнаўчых навук, вывучае народ. Але кожная з іх мае свой пункт гледжання, а літаратура мае «ўсіх разам» (прабачце, за грубасць). І даследаваць мастацкае народазнаўства, гэта задача ўсяго літаратуразнаўства, а не адной манаграфіі. Немагчыма расказаць у адной кніжцы аб тым, як у беларускай прозе XX стагоддзя адлюстраваны і сацыяльныя адносіны, і традыцыйная культура, і рэлігійныя звычаі, і культура побыту, і пра гістарычную псіхалогію народа ці народаў (калі гэта шматнацыянальная краіна) не

забыць. Але мэта манаграфіі Бароўкі была менавіта такой. У выніку, быў усё ж зроблены адбор на карысць адлюстраванню этнаграфічнай тэмы, прозы вясковай і гістарычнай тэматыкі. Тэмы гэтыя ў беларускай прозе традыцыйна ідуць адна побач з другой, таму і падзяліць іх пры аналізе даволі цяжка.

Гістарычная тэма, згодна думцы аўтара, праходзіць у ХХ стагоддзі шлях ад мадэрнісцкай артыкуляцыі Вацлава Ластоўскага ў «Лабірынтах» «неабходнасці паважлівага стаўлення да мінулага» [1, с. 44] да тыпалагічна блізкай яму творчасці Уладзіміра Караткевіча і да творчасці сучасных пісьменнікаў У. Арлова, В. Іпатавай і інш. Менавіта, у апошніх творах былі зноў адроджаныя назвы-імёны старадаўніх багоў, зорак і планет, строяў, звычаяў і г.д., «каб акцэнтаваць унікальнасць беларускага космасу, светаўспрымання сваіх землякоў» [1, с. 121]. Гістарычная літаратура другой паловы ХХ стагоддзя, дзякуючы закладзенай Уладзімірам Караткевічам традыцыі, арыентуецца «ў асэнсаванні мінулага… на даследаванне не сацыяльна-палітычнай гісторыі, … а на спасціжэнне нацыянальнага» [1, с. 119], таму яна сумежнічае з паказам этнаграфічнага побыту.

У манаграфіі пераважае даследаванне мастацкага адлюстравання этнаграфічнага матэрыялу, традыцыйнай беларускай культуры. Традыцыйная культура беларусаў перадаецца і праз асаблівасць летазлічэння, якое, як у «Камароўскай хроніцы» Максіма Гарэцкага вядзецца па народным календары, дзе асноўнымі датамі становяцца каляды, водахрышчанне, мясаед, масленіца, стрэчанне, вялікдзень і г.д. І праз традыцыйнае разуменне смерці ў той жа «Камароўскай хроніцы», як збега «трагічных ці недарэчных абставін»… або як «лагічнае завяршэнне наканаванага прыродай шляху…» [1, с. 83]. І праз мастацкае адраджэнне старадаўніх звычаяў, напрыклад, валачобніцтва ў рамане Лукаша Калюгі «Пустадомкі», а таксама ўваходзін, зажынак, дажынак, дакопак, змовін, вяселля, ці абраду нараджэння першага ўнука – «Бабінай кашы» (аднайменнае апавяданне У. Краўчанкі). Аўтар знаходзіць і прыклады выкарыстання ў мастацкай прозе фальклорных песень, паданняў, сказавай манеры аповеду, фразеалагічных выразаў і «гаваркіх» слоў [1, с. 128].

Зварот да міфалагічнага, сімвалічнага рада традыцыйнай культуры нараджаў у даследаванні цікавыя знакавыя мастацкія закамернасці. Напрыклад, асаблівай частотнасцю надзелены ў беларускай прозе вобраз ваўкалаўка, зварот да язычніцкіх багоў і звычаяў (творы Л. Дайнекі, В. Іпатавай, З. Дудзюк, А. Кажадуба і інш.). А такі мікракосмас традыцыйнай культуры, як хата, у творчасці Кузьмы Чорнага часта сустракаўся, як «вобраз недабудаванай хаты са сціплым сялянскім інтэр'ерам, якая станавілася ўвасабленнем недабудаванай для чалавека мірнай хады падзей» [1, с. 99].

Наогул, адлюстраванне беларускай рэчаіснасці праз этнаграфічны пласт вясковага жыцця вельмі перспектыўны шлях літаратурнай творчасці айчынных пісьменнікаў у ХХ стагоддзі, на што звяртае ўвагу даследчыца ў сувязі з аналізам «Палескай хронікі» Івана Мележа. Гэта – творы і В. Адамчыка, і Г. Далідовіча, і Г. Марчука і інш. Этнаграфічны матэрыял на працягу ўсяго ХХ стагоддзя выкарыстоўваецца беларускімі празаікамі: дзе як фон дзеяння, дзе – як правакацыя сюжэта, дзе – як эмацыянальны характэрны для персанажаў каларыт, дзе – як сацыяльная з'ява – то забабоны, то прыклад патрыятызму.

Нездарма аўтар манаграфіі не абыходзіць у аналізе мастацкай прозы такія бліскучыя прыклады эсэістыкі на этнаграфічную тэму, як аповесць «Вечны кругазварот» Барыса Сачанкі (як вызначае яе В. Бароўка, «тыповае этнаграфічнае эсэ з элементамі белетрызацыі» [1, с. 115]) і «Зямля пад белымі крыламі» Уладзіміра Караткевіча (гэтае – «пераадкрыццё і паэтызацыя беларускай зямлі» [1, с. 118]). І, канешне, В. Бароўка падрабязна аналізуе так званыя эпічныя творы І. Мележа, В. Адамчыка, І. Чыгрынава, Б. Сачанкі. Аўтар слушна пры гэтым заўважае, што яны належаць да «шматнацыянальнага рамана са складанай кампазіцыйнай арганізацыяй» і «за іх аб'ёмнасць, а не за праблематыку названы эпапеямі» [1, с. 139]. Перш за ўсё – гэта вясковая проза, дзе традыцыйны мікракосмас (ці «мастацкае народазнаўства») з'яўляюцца галоўнай тэмай.

Трэба заўважыць, што аналіз асобных перыядаў ці асобных твораў цікавы новымі высновамі, меркаваннямі, паралелямі, але ўсё роўна атрымаўся «Кароткі нарыс мастацкай прозы ХХ стагоддзя», або павярхоўнае даследаванне мастацкай прозы ХХ стагоддзя, з выдзяленнем пэўных перыядаў, твораў, аўтараў і «адсевам» некаторых аўтараў і твораў.

Аналітычны перагляд беларускай прозы спарадзіў сучасныя рэцэпцыі аналізу. Так, аповесць «Салавей» (1927) Змітрака Бядулі набыла новы канфлікт – не сацыяльны, а творчы, бо мастацкая дзейнасць пана Вашамірскага, адарваная ад народнай глебы, падобна да пазіцыі пралеткультаўцаў і РАППаўцаў [1, с. 61].

В. Бароўка «прыстасоўвае» да беларускай прозы бахцінаўскую тэорыю «двухгалосага слова», і літаратура 1930-х гадоў (творы М. Гарэцкага, З. Бядулі, К. Чорнага, Л. Калюгі і інш.) становіцца «мастацка-маўленчай з'яваю «двухбаковай накіраванасці» [1, с. 89], маўляў, пішуць «адпаведна афіцыйным ідэалагічным устаноўкам, але… і праз такі паказ прабівалася праўда часу» [1, с. 89]. Такім чынам аўтар дае асаблівую адзнаку творчасці савецкіх беларускіх пісьменнікаў. Яна абвяшчае, напрыклад, творчасць

Кузьмы Чорнага «мастацкай крыптаграфіяй, у якой не апошняе месца адводзіцца амбівалентнаму паказу этнаграфічна-бытавых рэалій» [1, с. 91].

Але павярхоўнасць ці абцяжаранасць тэксту не вельмі ўдалай тэарэтычнай высновай перашкодзілі даследчыцы, напрыклад, падрабязна прааналізаваць тэму «знікнення сялянскага мацерыка» спачатку пад нагамі сацыялістычнага будаўніцтва, потым – пад фашысцкай навалай, якая толькі прагаворана [1, с. 132]. Канешне, імкненне падабраць усе характарыстыкі ў адным абзацы (з-за недахопу месца ў кнізе) парадзілі і невыразныя, груваткія сказы, тыпу: «У яго творах (Міхася Стральцова – *Н. Л.*) мастацкія элементы ўзаемаабагулены, пры гэтым культуралагічная функцыя этнаграфічна-бытавога матэрыялу рэдукавалася або станавілася творчай, сэнсава-генератыўнай ці стылеўтваральнай у выніку яго мадэрнізаванай інкарпарацыі» [1, с. 129].

Асобна трэба падкрэсліць важкасць аналізу сучасных твораў, якія маюць сёння мала крытычных водгукаў. Бароўка дае агляд твораў Алега Мінкіна, Юрыя Станкевіча, Алеся Наварыча, Людмілы Рублеўскай, Андрэя Федарэнкі, Франца Сіўко і іншых сучасных пісьменнікаў. Яна робіць слушныя заўвагі аб нацыянальнай арыентаванасці твораў, дзе «чужынцы… паводзяць сябе як гаспадары, бо не знаходзяць належнага адпору з боку мясцовых жыхароў і ўлад» [1, с. 156], дзе ідзе аповед пра пакаленне беларусаў, «дэнацыяналізаванае самімі абставінамі існавання» [1, с. 168] і дзе адбываюцца «метамарфозы этнічнай памяці» [1, с. 162].

Многа месца ў манаграфіі (асабліва пры аналізе сучаснай літаратуры) аддадзена стылістычна-жанравым вызначэнням сучаснай прозы: ад разгляду фэнтэзі да літаратуры non-fiction. Так, Бароўка вызначае шмат стылістычна-жанравых асаблівасцяў сучаснай гістарычнай прозы: «гістарычная інверсія» [1, с. 171] (аўтар выкарыстоўвае тэрмін М. Бахціна) ці ідэалізацыя, міфалагізацыя мінулага ў творах Вольгі Іпатавай і Кастуся Тарасава, асучасніванне гісторыі і белетрызацыя гістарычных падзей у раманах «Кліч вечнага звону» Генрыха Далідовіча і «Вялікая княгіня» Івана Шамякіна, кантамінацыя мастацкага і дакументальнага матэрыялаў у раманах «Храм без бога» Вітаўта Чаропкі, «Круг» Алеся Пашкевіча і «Белая дама» Аляксея Карпюка, «філасофскі падыход да ажыццяўлення мінулага і ўзвелічэння чалавека-патрыёта» [1, с. 174] у творах Уладземіра Арлова, «спалучэнне прыёмаў рэалістычнай, рамантычнай і постмадэрнісцкай паэтыкі» [1, с. 177] у творах Людмілы Рублеўскай і інш.

Манаграфія В. Бароўкі значная сваім сучасным аналізам, праглядам беларускай прозы XX стагоддзя. Вельмі хочацца спадзявацца, што яна не страціць сваіх чытачоў (перш за ўсё, тых, хто вывучае беларускую літаратуру) з-за недакладнасці назвы з яе вельмі шырокімі тэарэтычнымі высновамі.

ЛІТАРАТУРА

1. Бароўка, В.Ю. Мастацкае народазнаўства ў беларускай літаратуры XX стагоддзя (на матэрыяле прозы) / В.Ю. Бароўка. – Віцебск: УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2009.

***Н.Б. ЛЫСОВА, кандыдат філалагічных навук, дацэнт***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***